Асобны № каштуя усюды 40 кап.

Працоуны народ усіх краеу—злучайся!

ДЗЯННІЦА

ВЕСТКА БЕЛАРУСКАГО НАЦЫЯНАЛЬНАГО КАМІСАРЫЯТУ.

КОШТ ГАЗЭТЫ.		
	У РАСЕІ.	ЗА ГРАНІЦУ.
1 м.	1 р. 80 к.	3 р. — к.
2 м.	3 р. — к.	4 р. — к.
3 м.	4 р. 25 к.	6 р. — к.
4 м.	6 р. — к.	8 р. 70 к.
6 м.	8 р. 50 к.	12 р. — к.
9 м.	13 р. 50 к.	18 р. — к.
12 м.	17 р. — к.	20 р. — к.

Перамена адрысу 50 к.

Выпісваючым некульні экз.—робіцца скідка 20%.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52. Тел. 1-51-63.

№ 38.

Рукапісы, якія прысылаюцца у радакцыю ля друку, павінны быць напісаны разборна і на адным боку паперы.

Ня прынятыя рукапісы ля друку звяртаюцца аутарам назад, калі ля пірасылкі іх прыслана марка, як не-та зніштажаюцца. Радакцыя пакідая сабе правы папрауляць рукапісы.

Радакцыя адчыняна ад 11 да 4 г. У гэты часы прымая і радактар.

Масква, 1918 г. 19 Наября. Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц. І-й год выданьня.

Канцылярыя Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту адчыняна што дня, апроч сьвят, ад 10 г. да 4 гадзіны дню.

АД ВЫДАВЕЦКАГО АТДЗЕЛУ БЕЛ. НАЦ. КАМІСАРЫЯТУ.

Выдавецкі Атдзел Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту у Маскве склікая на 30 наября гэтаго году параду выдавецкіх атдзелау і падатдзелау Белнакома. На параду запрашаюцца усе супрацоунікі „Дзянніцы“, „Чырвоны Шлях“, „Беларуская Крыніца“, „Белоруссія“, а так сама і радактары іх. Парада адбудзяцца у будыніня Бел. Нац. Камісарыяту (Масква, Паварская, 52.).

Ад Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Беларускім Нацыянальным Камісарыятам адчыняны атдзелы Камісарыяту: у г. Вітабску (Суворауская, д. 48), у г. Смаленску (Б. Казанская, 14) і у Петраградзя (Тэатральная, 3). Па справам беларускім радзіцца усім зварочвацца па гэтым адрасом. Там жа прадаюцца беларускія кніжкі і газэта „Дзянніца“.

Б. Н. К.

Да ведама беларусау бежанцау.

Бежанскі атдзел Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту мая сваіх прадстаунікау (эмісарау) вось у якіх мейстох: у г. Воршы (Слободская ул., д. Лібстера), т. А. К. Дубіцкі, у г. Саратавя (гасцініца „Асторія“, кв. 78) т. А. Е. Сцепанюк, у Калузя (пленбеж), т. Васілевіч. Па усім справам, датычным бежанцау, прозьба на местох звертацца да гэтых людзей па упомняных адрысох.

Бежанскі атдзел Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Масква, 19 наября.

Святкаваньня у Маскве гадавін Акцяберскай Равалюцыі адбылося „вялічава і стройна“. Самыя смелыя надзеі былі пярамажаны тымі скуткамі сьвята, якія дала чырвоная працоуная Масква. Праз два дні і дзьве ночы вуліцы кішэлі народам, бадзіора і святашня настроянным. Святашні настрой ня толькі выглядау на тварах мільенау народу, а і чууся у празрыстум васеньнюм паветры і у зыркум яснум сонцу. Па усім ясна было адметна, што Расейская Равалюцыя праз год свайго жыцьця заваявала да сябе спагаду і прыхільнасць працуючых массау.

Боляй таго, у маніхвэстацыі на другі дзень свят, бачылася вялікая таржаство яе. Нескайчанны цуг маніхвэстуючых па вуліцах Масквы і па Чырвонум пляцу рабочых, селян, служачых і чырвонае армії з нязлічанымі сцягамі і з нязмоучным пеяньнем равалюцыйных песянь, цьверды поступ іх стройных радоу казала усякаму аб тым, што пярад ім праходзіць ня проста народ, а сьвядомыя ваякі за равалюцыю, равалюцыйная армія, якой равалюцыя робіць агляд. Армія, так багата вырасшая за адзін год! Што гэта армія да таго магутна, што мусіць з ею палічыцца ня толькі расейская, а і сусьветная буржуазея!

І у першы чарод, бачучы гэту магутную армію працы, гэта войска чырвонае Распублікі, магла ясна ачуць сваю слабасць прад ею расейская буржуазея і усе варагі Савецкае улады. Бо калі і мелі яны да акцяберскаго сьвята якую-кольвяк надзею на адхільнасць працоунаго народу ад „бальшавіцкіх“ парадкау, калі і было у іх сумленьня на конта абароннай сілы ля равалюцыі, та сьвята іх разуцешыла у канец і дало угледзяць—што працоуны народ праз год жыцьця Сацыяльнае Равалюцыі зжіуся з ею ікрас, прыняу да свайго нутра яе і зможа пастаяць за яе ахову.

А за расейскаю, німа сумленьня, што і чужаземная буржуазея прызадумаяцца над тым, ці легка ей удасца саўладаць с чырвоным здапьням усясьветнаго паустаньня, на касцер якога падаюць іскры з Расеі.

Задумаюцца—але дарма ужо усякія думкі, дарма і рады ды способы будуямыя імі! Саўладаць з чырвонай Расеяй, маючай тую сілу і моц, якія паказала вялікая сьвята, ня ліогка, калі і сусім нельга.

Цвіордым, уверанным усе пабораваючым поступам нясецца каляска равалюцыі уперад ды уперад. Край за краям паглынаюцца чырвоным прамянем яе: спадаюць з пасадау пядауніія магутныя уладыкі, царыкрывасмокі, рушацца у шпэлах залатыя палацы іх і злятаюць абмытыя крывіою кароны ды выпадаюць з рук скіпятры.

Добры на пачатак, Мікалай Крывавы Расейскі павіоу за сабою у яму зніштажэньня цугам с перш Фердынанда Баўгаурскаго, потым Карла Аустрыяцкаго, а цяпераку ужо і свайго сябра, Крывавагo Вільгэльму Нямецкаго. З на 10 чысло гэтаго месяцу страпянууся гэрманскі працоуны народ, рабочыя і салдаты, і парвау ланцугі свайго прыгону. Сталіца Гэрманьні, Бэрлін, апалілася чырвоным промінам паустаньня і хутка стала абурваць стары крывавы прыгонны парадак, самауладства паганай буржуазеі і памешчыкау з Вільгэльмам уперадзя. А з Берліну, чынным, уверанным поступам раскаціуся равалюцыйны рух і па усіой Гэрманні, з пауночы на поудзянь. І сьвет ізноу служыць светкаю вялікіх жыцьцявых здарэньняу, працягу развіцьця Сацыяльнае Равалюцыі.

На мест карановaнаго кровасмока ужо сядзіць у Бярліня народная правіцяльства з сацыялістам Эбертам у старшынству і з незалежнымі сацыялістамі у далуца. А па многім гарадом закладаюцца рады работнічых і салдацкіх дапутатау, якія страчаюць цеплую спагаду і шчырую прыхільнасць у народа ды забіраюць сабе уладу. Прауда, яшчэ нельга казаць аб скончанным запанаваньні равалюцыі у Гэрманьні, бо яна яшчэ у разгару свайго вышэйшча, толькі ужо зусім ня можа быць і сумленьня, што яна выйдзя пабядзіцялям, і да Радавае Расеі прылучыцца Радавая Гэрманьня.

Крок за крокам, цьвердым поступам, рухая усясьветная аслабаджэньня працоунаго народу, паглынаючы адну старонку за другою, уцягаючы у вырай равалюцыі адзін народ за другім.

З ліогкае рукі Расейскаго працоуніка узяліся за міжнародную справу работнічаго люду баўгары, аустрыякі і гэрманцы, падаючы руку падсоб'я акружанай усясьветным грапауніцтвам Расейскай Сацыяльнай Распубліца. І німа сумленьня, што следам за імі крапуцца па гэтуй дарозя і дасюль яшчэ паслухняныя сваей буржуазеі народы Пранцыі, Англі і Амэрыкі. І сьвет ня мая гэткай сілы, якая б магла сустрымаць хадзьбу міжнароднаго паустаньня працоунаго народу, і дарэмны усе рады дзеля гетаго крывавай буржуазеі. Німа сілы, німа рады! Бо само жыцьціо вядзе яго за сабою!

Пэуна, гэта вядома усім варагом і далакопам свабоды, і нябось ня суцешыць іх гэрманская равалюцыя! Калі дагэтуль яшчэ яны бачылі у гэрманскум салдату послухнянаго рабака, ідучаго на забіуства расейскай равалюцыі, як усясьветнаго вогнішча, дык цяпераку ужо сіла яго пакірована супроць іх самых, вогнішча гэта распаляяцца і гэрманскім працауніком.

Трапячы усясьветная буржуазея, канец твой прыходзіць к табе!

Слава паустаушаму нямецкаму народу!

Слава Расейскай Равалюцыі!

МЯНЯЮЦЬ ШЭРСЬЦЬ.

Заслепляная усцішшам сваe гібялі і чуючы, што падыходзяць яе апошнія часы з пашырэньням равалюцыйнаго руху па усяму сьвету, расейская буржуазея хапляяцца за кожную саломінку, абы ня захлынуцца і назаусягды нятраціць свае валадарства. Пасля таго, як палітыкам Гэрманії удалося скарыстаць васпную слабасць Расеі дзеля захапляньня ускраінных земель, пасля таго, як былі «самаапрадзяляньнія», нават самыя пявялікія воблацці, дзе пачау устанауляцца пад аховаю нямецкаго лайтананта «парадак», у гэтыя воблацці стосам памчаліся тыя, каму нянавісна была сацыяльная равалюцыя. Чорнасотнікі, кадэты і контар-равалюцыянеры усякае ахварбоукі забілі сабою Рэваль, Рыгу, Кіеу, Адэсу, Новачаркаск і г. д., дзе яны знайшлі прывітнасць з боку нямецкіх гэнералау, якім гэтак сама трэба ж была бытцам мейсцовая грамада, якая пражэцца к хаурусу і аб'еднаньню з Гэрманіяй. Асабліва багаты такімі элемэнтамі поудзянь—Украіна, Крым і Доншчына. Нарыхтоуваліся сюды дзеля таго, што чулі там сабе падтрымапьня з боку іназемнае буржуазеі, бо гэтыя багатыя воблацці цягнуць кожнаго імпэрыяліста. Значыцца, там заусіоды будзя нейкая чужая сіла, якую можна будзя скарыстаць дзеля сваіх мэтау — задушэньня працоунае равалюцыі. Вось каля 9 месяцау гэтаю сілаю была пута нямецкаго юнкяра. Пад яе і клалі сваю галаву далакопы расейскае равалюцыі. І за іх паслухмянасць, ліспівасць іх жа шкадавалі, пасабляялі ім зніштваць равалюцыйныя пралятарыят і селянства Украіны. Здавалася, што больш верных хаурусінікау і разам с тым падданых нямецкаму Кайзару і шукаць ня трэба — ня знойдзяш с агніом. Нават „сам“ Мілюкоу, некалі надбухторнік змаганьня за праліва і прыхільнік вайны «да набеднаго канца» з Гэрманскаю калицыяй—і той нават размеркавау, што трэба трымацца хаурусу і аб'еднаньня з Гэрманіяй.

Але ці мала цудоунаго на сьвецця? Іосць жа такія хворыя на вочы, якія белая завуць чорным і наадварот. Іосць і здаровыя, але натта ядлыя людзі, якія сіодні с табою, а заутра зміраюцца с тваім ворагам, калі з ім можна што-небуць скарыстаць ад цябе. Вось наша буржуазея і хворая і ядлая зараз: яна ня разбіраяцца у хварбя і гатова далучыцца да кожнаго, хто карыстауней у той ці іншы час. Была Гэрманія мошнаю, здавалася, што ніякая сіла ня варухне Вільгэльма і Гіндэнбурга. Народ толькі крапууся, і сіла гэтая уздрыгнула і начала слабнуць, а з ею і тыя дзеі, якія яна выпаупяла: дзеі ваіоунічаства. Сіла імпэрыялізма выcклізнула з рук Людэндорфа, а потым і самога Вільгельмы і іх перaляцела да Вільсана, Клемансо і Ллойд-Джорджа. Гэтыя апошнія у сваіх мэтах так сама прагуцца „ратаваць“ Расею, і пасля заміраньня Баўгары і захапленьня Варны і Канстанцы, прымусілі Турцыю да заміраньня дзеля вольнаго праходу праз Дарданеллы у паудзіонную Расею... Бліжыцца іншая моцная сіла. І контар-равалюцыянеры, згуртованыя на Украіня у адзін позірк перавярнулі свой напрамак, зразу змянілі шэрсьціньня: хутка уцічалася між імі арыянтацыя у бок хаурусьнікау. Лэцяць уверх нагамі украінскі кабінэт міністрау, каля Новачаркаску складаяцца скарасьпелая і смсутворная правіцельства „усяе Расеі“, у Кіявя кадэты сзываюць свае зборышча і гатуюцца сустрэць, як мая быць, новых апякуноу і памоцнікау, у Яссах няспыхаўна ідуць парады расейскіх чорнасотнікау з хаурусьнічымі генерал[illegible] на конта задушэньня Расейскае [illegible] люцыі. З усяго гэтаго відаць [illegible] што на Украіня гатуяцца новая бар[illegible] за равалюцыю, быць мажа самая [illegible]

Але гэтая барацьба нямінуч[illegible]

...ца адоляньням равалюцыі. Надзея ...му—у тым руху, які ідзе па усяму ...ту за замірэньня і згоду народау, ... ня урадау. Калі ж часова хаурусьнікі ...хопяць наш поудзянь, то гэта толькі ...бліжыць равалюцыю у іх. Няхай па...іць на Гэрманію — угледзяць падма...ньня гэтаму. За эрманьняю поідуць ...гія.

М. Н.

Лопая.

Што панству багатых над беднымі ...ходзіць канец ня толькі у Расеі, а ...а усім сьвеця—гэтаму ня трэба сумля...ца. Кожны дзень нам прыносіць аб сім ...вядчэньня цэлымі знізкамі здарэньняу ...у бягучум жыцьці. Дух аслабаджэньня ...ацоунага народу усякімі спосабамі вядзе ...гу з самауладствам буржуазеі и ваяуні...тва, няшчадна разбіваючы той хунда...іт, на якам яно дагэтуль трымалася. ...большасьці мейстох выбухая усе га...эйшая ды гастрэйшая клясавая спрэчка, ...учая справы да равалюцыі, у некато...х жа, дзе поміж з эканамічным і па...ычным усціскам, бушуя усціск і на...янальны кіпіць рэзкая нацыянальная ...змаганьня, цягнучая за сабою і ...савыя спрэчкі і тую ж равалюцыю. ...глядным адбіткам страшэннай нацыя...ьнай змогі есцяка Аустра-Вэнгрыя. ...а гасударства збудована на нацыяналь...і прыгнячэньню: дзьве пануючыя на..., спраудняй, буржуазея і багатыя ...ны дзьвух нацыяу, у вайходзячых у ...ад Аустра-Вэнгэрскаго гасударства—гэ... немцы, аустрыякі і вэнгры, здауных ...оу заграблі пад сябе боляй дзісятку ...бейшых нацыяу чэхау, палякоу, ру...у, славакау і др. і узвялі над імі ...ю уладу, узбудованую на цяжкум ...гнячэньню і поунум бязпрау'ю. На ...цягу доугіх часау, усе пробы гэтых ...ыянальнасьцяу пазмагацца за свае пра..., давалі малыя скуткі, бо яны пра...зіліся рожнымі нацыямі у рожныя ...ы і працоуны народ іх ня так шчыра ...мау да сэрдца нацыянальная аслабад...ньня. Дзякуючы гэтаму, правіцяльству ...ка было душыць усякія паустаньня і ...бацьць просьбам асобных нацыянальна...у. Прауда, прыходзілася, акром гэтае ...ствосьці, іці і на хітрыкі ды выхілясы ...з тоя, што яно як-ніяк, а баялася ...зору дзеля хауруснаго выступу усіх ...гнечаных нацыянальнасьцяу супроціу ...го. Гэты хітрыкі былі такімі: праві...ьства разглядала, якая нацыя мац...шая па ліку, па асьвеця і нацыяналь... сьвядомасьці, той яна і рабіла ля отчэп...о тыя ці іншыя уступкі ды паслаб...ньня. Так было з чэхамі, палякамі і ...гімі, якія першымі дамагліся сваіх ...зрсытэтау і шырэйшых выбарчых ...воу. Але гэтым яно мала выгравала: ...учы уступ суседу, пакрыуджаная на...і упарцяй старалася дамагацца і сабе ...э ж самаго. І праз гэта весь час ...цьця Аустрыяцка-Вянгэрскае дзяржавы ...сціхау нацыянальны рух, вызываючы ...станьня прыгнечаных нацыянальна...у і ідучыя за імі крывавыя падавы ... правіцяльствам.

...акім чынам сяк-так абярагауся распад ...ударства і подскакам узростау капіта...і, ваяупічаства і панства іх над пра...ным народам многіх рожных нацыяу. ...ла надзея у буржуйнаго самауладнаго ...віцяльства задушыць усякую праяву ...кіх паустаньняу. Але, ушчатая ікрас ...вязікая вайна першую атзяку падара...а Аустра-Вэнгрыі: с самаго пачатку ...у старане хутка пачау расці і гастрэць ...ыянальны рух: сваяцкія сэрбам наро...як Гэрцогавінцы і Боснійцы ды дру... сталі адказвацца ваяваць з раднякамі, ...се народы прыгнечаных нацыяу на...л паварэжыліся супроціу зацелу свай...рыгнітацяля правіцяльства і няахвот...ішлі абараняць вялікадзяржауныя ін...эсы яго.

...ось мы і бачым, што згуртованыя з ...гнечаных нацыянальнасьцяу палкі цал... здаваліся у палон і гэтым страшэнна ...ілі аустра-вянгэрскую моц. У гэты ж ...і час, у старане хутка уздымалася ...ыянальная спрэчка, якая к сучаснуй ...і дайшла да таго, што паставіла бур...ная аустрыяцкая правіцяльства у ...ая палажэньня. Якія рады яно ня ...умоувала, каб прыдавіць нацыянальны ...х, нішто ня памагала: ен да таго узялу ..., што ім праніклися усе станы кожнай ...і, ад буржуазеі да салдат і рабочых, ... усіх бакоу узбурыліся на правіцяль... грозячы разарваць гасударства на ...ткі.

...аб збавіцца ад гэтага, тады цар Карл [illegible]

...доугі час здзяк, працоуны народ прыгня...чонных нацыяу і на гэты раз ня спадзяецца на шчырасьць цара Карла і вядзе далей барацьбу. Можна смела казаць, што гэта барацьба, умацоуваемая і клясавым адметкам, нясе с сабою поуны развал трымаушае на рабсцвя Аустрыйска-Вянгэрскае дзяржавы—на мейсца якое мая вырасьці некулькі другіх.

Мы павінны цешыцца гэтым, бо усякая аслабаджэньня прыяя свабодзя. Скінуушы перш панства нацыянальнасьцяу, увайходзячых у злуку Аустрыі, легка скіня с сябе і слабую сілу уласнае буржуазеі, калі толькі заучэсьня злучыцца на працоуных закладзінах і ня дасць сабе абмануцца зорачым на іх апеку другім вялікадзяржауным грашаунікам, як амэрыканскім, ці англіцкім; а так сама, калі ня ап'ецца нацыянальным пачуцьціом, як то відаць сярод прадстаунікау польскае, чэшскае і навэт нямецкае нацыі, і ня забудзя інтарэсау клясавых. Нацыянальная аслабаджэньня заусюды вядзе за сабою і аслабаджэньня палітычная ды аканамічная. Гэта закон жыцьцявога поступу.

Змітро Жылуновіч.

Да бядняка-беларуса.

Што ты думаяш, братка, гледзячы на тоя, што робіцца у тваем роднум краю?

Цяперь, напрыклад, там гаспадарацьнемцы... Як падабаюцца табе іхнія парадкі? Але яны рыхтуюцца ужо пакінуць твой край... На іх мейсца зьбіраюцца другія—твае старыя знаемыя: ласкавыя паны, добрыя бацюшкі і праборшчы, спраунікі, станавыя, ды урадпікі с панком старшыней. Яны зьбіраюцца наладаваць ля цябе даунейшыя парадкі—сабе па панаваньня і табе, бядняку, на горкую нядолю. Змаленства прывыкшы сядзець у цябе на карку, яны ня магуць жыць бяз тваёго мазуля і хочуць забязпечыць ля сябе такія парадкі, каб ты іх гадавау да самае сьмерці... Забраушы у свае лапы вялікія абшары найлепшае зямелькі, яны ня хочуць самі яе абрабляць, бо добра ведаюць, што ты, маючы вузянькі шнурочак, альбо і таго ня маючы,—мусіш іці да іх на акаленства у парабкі, альбо падзенна поузаць за дарма і гэтым паможаш ім каліту тужэй набіваць. А сам ты, прадаушы сваю працу і страціушы сілу і здароуя, ня меушы ні воднаго дзянька шчасьлівага у жыцьці, памрэш у нядолі і бядпаце... Можа яшчэ і дошчак ня хопіць табе на дамавіну... А глянь далей—колькі яшчэ сабралася дармаедау навакол цябе, апрыч пана-памешчыка, каб, як тоя зьвярье, паглытаць усе тоя, што ты прыдбау, працуючы ад раньня да смярканьня! Лічучы сябе начальствам, а цябе паставіушы ні у вашто, яны ні працуючы, ні гаруючы живуць сабе у шчасьці і багацьвя. Спытаць цябе—чаго ж ты маучыш? Чаму ня скажаш ім—„прэч!"—Я сам напрацавау і здабыу усе гэтая,—сам і скарыстаю!

Не, ты гэтаго ня зробіш. Бо тваю душу і сэрца яны наладзілі так, як дзеля іх карысна. З веку у век утлумачылі табе, што гэтак быць павінна, а ня іначай, і так нарыхтавалі твою сьвядомасьць, што часта і сам ты кажаш: „рана яшчэ даваць волю народу". А калі ты скажаш што на супраціу,—дык поп з ксяндзом нагоняць на цябе жаху пеклам, і ты маучыш і моучкі ліеш слезы, ды молісься, каб бог падаравау табе грахі... І выходзіць так, што ты, працоуник, павінян марнець з голаду, а паны, папы, ксяндзы, ды усялякія дармаеды павінны жыць у сытасьці і раскошы, ды цешыцца... Яшчэ ня так цяжка было-б глядзець, каб ты цярпеу ад таго, што яны на своем баку маюць вялікую моц, маюць сваіх уластных вартаунікоу гэткаго парадку. Тады... што ж зробіш,—мусіш цярпець... Але горна тоя, што ты сам, як мага, пасабляяш ім каваць на сябе ланцугі!..

Цяпер, на прыклад, як немцы зьбіраюцца пакінуць твой край, паны на іх мейсца спешаюцца згуртаваць свае войска, каб абараніць свае панства, свае багацьва і свой закон. З каго ж яны зьбяруць свае палкі? Можа, думаяш, з сваіх сыноу? Не, браця, твой сын туды пойдзя і будзя служыць табе і сабе катам. Та богам, та зморам яго завабяць паны і самі будуць спакойна спаць... А ты мурашкай працоунай будзяш цягаць ім усе патрэбная дзеля іхняго панаваньня. І каб пацешыць сябе, ты скажаш: „Я радзіуся мужыком, мой бацька, дзед і прадзяд жылі так,—пражыву і я..." А паном ад гэткай твяей думкі на сэрцы [illegible]

І гэную навуку ты прымаяш за шчырая слова божая, ня падумаушы, к чаму яно гнецца тут. Хай бы ж ты спытау яго: „бацюшка, чаму ж ты сам ня мучышся, каб мець па нсбя панаваньня, а лупіш з нас шкуру, каб на зямлі добра жыць?"

Цяпер ты сам падумай, бяз кніжкі з навукай божай,—ці можа быць бог лепшым да гэтых дармаедау, ці да горкае долі бядняка?

„Не, здаецца ня павінян",—скажаш ты. А у чым жа тут сакрэт?

Да у тым, каб мець дзеля сябе найлепшыя парадкі, папы і усе дармаеды тлумачаць навуку так, як карысьней дзеля сябе. Хрыстос калісь казау, што прыдуць у сьвет, замест Яго, вучыцялі іншыя і назавуць сябе паследувацялямі яго. Ня верця ім. Глядзеця з іхніх дзел на іх навуку.

Пакінь жа дарэмна цешыць сябе, гаротны мой брат. Скажы усім: „Годзі ужо цярпець, прышла пара скінуць з сябе апеку! Я ня пайду у панскія палкі, я ня хочу быць катам ля свайго брата!"

Будзь жа ужо і ты чалавекам, бядняк-беларус!

Беларус Яухім.

Москва, Кремль, ЛЕНИНУ.

Первая Конференция Ответственных работников Белорусского Комиссариата, задавшаяся целью создания среди трудового населения Белоруссии реальных сил для мировой социальной революции и диктатуры пролетариата, на первом заседании 2 Ноября избрала Вас, дорогой Владимир Ильич, как вождя всемирной революции, своим почетным председателем и просит принять.

Председатель **Лагун.**

Секретарь **Хренов.**

Москва, Кремль, кавалерийский корпус, СТАЛИНУ.

Первая Конференция Ответственных работников Белнакома на заседании 2-го Ноября избрала Вас почетным председателем, как истинного выразителя классового движения национальностей. Просит завтра, 3-го Ноября, в 12 часов, почтить своим присутствием.

Председатель **Лагун.**

Секретарь **Хренов.**

Як жа з Беларуссю?

З кожным часам сусьветныя здарэньня пашыраюцца і развіваюцца з пятрымным пэнтам. Кожны дзень нясе с сабою новыя і новыя мажлівасьці, аб якіх ня толькі ніхто яшчэ учора з нас ня спадзявауся, але і думаць ня думау. Гэтак, зусім нядауна нельга было і заікнуцца аб гэткум скорум і раптоунум расколу сярод сярадковых хаурусьнікау, Гэрманіі і яе сяброу. Тым часам Баугар'я кінула вайну, за ею хутка тоя зрабіла Турцыя Аустрыя і Гэрмапьня.

Пабора апошняе прывела да равалюцыі і сапханьня Вільгэльма.

Ня заутра, пазлязаутра мы можам прашнуцца і прачытаць у газэтах, што дбайныя імпярыялісты зрабілі згоду і маюцца усесціся за сталы плянаваць і кроіць Эуропу па свояму. Тая паслухмяпасьць, з'якою адносяцца покуль што працоуныя станы да сваіх правіцяльствау у Амэрыцца, Францыі, Англі[і] і інш гасударствау, нас вельмі могуць трывожыць за ліос у скор[ы] час сусьветнай равалюцыі і праз гэта [illegible] у праступнай гэтай працы [illegible]. Праявы яе наагул ня даюць [illegible] упасьці па тоя, што працоуны [illegible] вающіх гасударствау сам скончыць вайну, як тоя сталася у гэтым пр[ыпадку з] расейскім народам. І вось, праз гэта вытыркая на повярх перад намі, беларусамі камуністамі і усім беларускім працоуным народам, адно дужа вагкая, дужа значная і у той самы час вельмі казлытная пытаньня: што станяцца з Беларусьсю? Які ліос яе чакая? З'якою доляю ёй прыдзяцца спаткацца?

Весь час, са дню расейскай равалюцыі, беларуская пытаньня нядбайна прапушчалацца між пальцау: яму ня было удзеляна ні годным складам правіцяльства жаднае увагі. Нібы якая ліхая прымха гэтта прашкодзіць, нібы мара таму віною, што усе, хто б мог гэта і меу сілу, баяцца дакрануцца да яго і знарочыста, ці забыуна адварочваюцца і ад думкі той, што есцяка Беларусь, а знача, есцяка і беларуская пытаньня. Усе патугі звярнуць на гэта увагу каго належыць, разбіваюцца у дробкі, бы шкелка аб камянь. Ні пастановы з'ездау, ні патрабаваньня 10 тысячных мітынгау—нішто ня прабірая тоустаго слою поунае адцуранасьці ад столь значнай і важнай справы, як беларуская пытаньня. Наадварот, чым далей, тым боляй расце некая сумыслая варожасьць да яго у кіруючых колах.

Гэта ня нармальна, гэта навэт боляй ненармальнаго. Беларускім камуністам ня горай сваіх расейскіх таварышау вядома, [што] усякая нацыянальная справа ня м[ожа] [illegible] с клясовою барацьбою, калі [illegible] значнасьць апошняй. Цяпер[а] [illegible]. Але павінны і расейскія [таварышы], а так сама і уласьць рабоч[ых і] [сялян] [illegible] [р]аканацца тэю думкаю, што у [некаторых] [выпа]дках бяз яе нельга абыйсці [illegible], каб балюча ня закал[illegible], каб ня прынясьці ля яе [illegible]. [Та][я] справа стаіць у гэткуй палаж[эньні] [illegible] пытаньням. У той час, к[алі] [illegible] адмахваямся рукамі ад яго, [illegible] духу шавінізмы, калі [illegible] імям празваць гістарыч[illegible] [к]рай, калі ні годнаго слова [illegible] т. камісара іназемных спрау. [illegible] праекту устрою у т. камісара [illegible]. [illegible]

браньня ею яшчэ добраго куску прадауніцкая Рада Беларуская у хауруся з памешчыкамі і гандлярамі вядзе торг. Ня схаваць таго, што Украінская буржуазея вустамі Скарапацкаго обяцала споуніць прозьбы іх. Ня чакаючы гэтаго, Рада нішчыць лясы і сплауляя у Скарападчыну, гуртуя белагвардзейцау, упрошвая немцау ня выходзіць з Беларусі (і даставалі раней уверра ад іх, што яны ня выйдуць); мала таго, ня скрытна і тоя, што Рада з Украінаю начыная нюхацца на усякі прыпадак з хаурусьнікамі... Гэта цяперака. А упярадзя—большая. Дастаушая абецу на самаістную адбудову свае незалежнасьці ад хаурусьнікау, польская буржуазея працягая руку на «спакон-вяковыя свае мейсцы ад можа да можа, ад Віслы да Непры». Каб толькі якім—ко[л]ьвек прычэпам адарваць ад Радавае Расеі большы кусок, буржуазея хаурусьнікау і з хаурусуючая з ею нямецкая буржуазея паложаць сваю руку [на] подпісы польскіх патрабаваньняу, хутчэй таму, што беларускаго голасу з Радавае Распублікі ня чуваць ні званьня. [Т]раз гэткія парадкі дзесяці-мільёны [бел]арускі народ можа быць ахвярованым [дзел]я падмацаваньня буржуазеі і грамаунітва, на шкоду Расейскай Равалюцыі.

[Як]імі ж вачыма мы тады, дачакаушыся, гэтаго, паглядзімо у вочы горацешнаму беларускаму працауніку? Што ен з нашай часткаю віны, падняпадшы у прыгон, скажа нам? Пэуна—ня падзякуя.

Пэуна—ня смашна станя і нам тады, як равалюцанэрам і як сынам свайго народу. Пэуна—мы будам каяцца, але будзя позна і нязваротна. Дык чаго ж, калі гэта нам заучэсьня можна зрабіць, сядзець склаушы рукі? Усю магчымасьць трэба нам звярнуць на тоя, каб абараніць Беларусь, працоуную, шчыра дэмакратычную Беларусь, ад падзелу, ля яе самое і ля расейскае равалюцыі. Нашы таварышы, трымаючыя уладу, павінны кінуць сваю нядбаласьць да цэлаго народу і ясна паставіць пытаньня аб долі Беларусі. Беларусь муся быць аутаномнаю часткаю Фэдэрацкае Расейскае Распублікі і больш нічога. Ні буржуазея суседняй Польшчы, ні буржуазея Украіны, разнімаючы рукі на яе захоп, ні тыя паскуднікі імперыялісты Гэрманіі, Амэрыкі, Англі[і] і Францыі ды др. краін, маючыя распарадкауваяцца ею—хай ня забудуць гэтаго, пачууушы з вуст кіруючых уласцю станау гэтыя словы. Думаяцца, што як т. камісар Іназемных спрау, гэтак і т. камісар спрау нацыянальных ды і т. т. з Заходняе Камуны загавораць аб сім настаяшчай моваю. Чакаяцца гэтаго, покуль ня позна.

Беларус камуніст.

Маленкі фэльятон.

Патраціу ікрас.

Язэп зранку сабрауся іці на засяданьня управы і у весь час, да абеду вясціханна пляпавау і абдумоувау сэнс тых прамоу, якія збірауся сказаць пярад сябрамі управы.

Надоячы язэпу трапілася адбываць пасядзэньня у устаноунуй калегі; там яму прышлося шмат і горача спрачацца на конта многіх пытаньняу, выпхнутых на парашэньня, і між іншым, аб беларускум пытаньню. Як і заусюды, Язэп любіу спрачацца, пярэчыць кожнаму прамоуцу, выпіхаючы наперад свае разуменьня таго ці іншаго пытаньня; так і учора грызся ен да поту, да асцы траха з усімі сябрамі калег'і. І прауду трэба сказаць, многіх пярамог, і легка пярамог. Толькі адзін ці два (еп ужо прызабыу) раз'юшылі яго нашчэнт, калі дакрануліся беларускаго пытаньня... Язэп лічыу сябе беларусам „чуць чуць ня велікарусам" па яго славам, і кожнаму казау, што ен абстойвая інтарэсы свайго краю... дужа-дужа блізкаго Расеі. „Беларусь трэба прасвяціць! Беларусь трэба эканамічна паставіць, на „уровянь" з другімі краямі. Беларусь"... аутаном'і, аднак, баяуся Язэп і чутку хіліла на гэта яго думка, як ен хутчэй абрывау яе і варочауся ізноу да першаго: „Беларусь трэба"... Але боляй ніш аутаном'і, Язэп баяуся мовы беларускае. І калі лічба пунтау яго праграмы пярабудоукі яго краіны пярабіралася ім некулькі раз, ен заусюды стараўся выкінуць пытаньня аб мовя. „Эх, ды гэта ж ліха ведая што за мова: яе стыдаяцца усякі прасьвячоны чалавек... тым боляй сацыяліст... Гэта—збор з усіх слоу... гэта шляхоцкая брахня, гэта... хамскі лепят! І знаходзяцца яшчэ людзі, што абстойваюць яе, навэт газэты шпуць на ей, кніжкі! Тьфу! Дурні. Шавіністы, нацыяналісты яны, або і горай... Шкода, што горшай клянушкі ня прыдумаць ля іх! Не, інтарнацыяналіст ніяшто ня стапя [illegible] пісаць. А я, як-ніяк, усе-ткі маю квіто[к] камуністычны, я інтарнацыяналіст! Вос[ь] я ніколі і дбаць ня дбаю праз гэт[у] ярундоускую мову. Во! хоць бы англійская, францускае,—то та мовы... або—эксперанская!" Усе гэты думкі, некульк[і] разоу прамігнулі у яго галаве і пошл[і] учарашняго пасядзэньня, і Язэп кожны раз крывіу тварыну і прыкушвау губ[у], калі успамінау аб учарашніх нацыянал[істах] шавіністах, абстойваючых мову беларускую.

— Не,—сказау ен сабе, ідучы на засяданьня:—я нізашта ня згаджуся, ка[б] наш журнал друкавауся па бел[ар]ускую. На вошта тая дурасьць! гэта ужо адміраючая мова! Ня здарма ж ні годзін беларускі вучоны ня умея яе.

Узяць хоць бы Карскаго, Любаускаго, Жуковіча, Базарэвіча, Хржонстоускаго [і] цэлы цуг іншых. Па расейску, па ісціна расейску кожны з іх і мысліць і піша. А ці скажа хто, што гэта ня вучоныя ня разумнікі, ня... „Язэп хацеу выгаварыць слова" інтарнацыяналісты, ал[е] штосьці папярхнууся і спыніуся. „А [у] навуца такі яны і гэткія", напраўіу ен сам сябе і здавольна усміхнууся. „Але у навуца — яны інтарнацыянальны, б[о] навука — ня мая пацыянальных меж..." Дык вось, на гэтум я і буду мацавацца! На гэтум! Хай толькі які нацыяналіст заікнецца аб беларускуй мовя, дык я яго на пауслова саб'ю... Саб'ю і н[е] рады!.."

Няпрыкметна ля сябе Язэп падышоу на адрыс засяданьня, к багатому трохатажнаму дому. Рэзва, чуць ня подскакам завярнуу ен у двор, узышоу на ганак [і] націснуу у бялянькі пупок. Яму адчынілі дзьверы і зачынілі за ім.

— Ці ужо засяданьня управы ідзе?—запытау Язэп швайцара.

— Ужо, ужо, с паугадзіны,—адказау той.

Я[illegible]

дамчауся па трэйці атаж, падніманючыся арабінамі праз два уступы на трэйці адно абсацы мільгалі. Праз пяць хвіль ен ужо адчыняу чырвоныя, на палову ашкляныя дзьверы, вядучыя у салю засяданьняу. Дзьверы ні скрыпнулі—так ціха хадзілі на рэхвах; вось чаму ен і ня спарушыу засяданьня: усе, як і да яго, сядзелі спакойна на крэслах, узіраючыся на прамоуцу, які стаяу на катадры і горача ды старэнна веу прамову; прауда, гэта ня напраткодзіла яму прыкмеціць прыход Язэпа.

Язэп, тым часам, прысеу і, слухаючы прамоуцу, прапускау галавою тэзысы сваіх думак і адначасна азірау пляшывыя сівыя голавы слухачоу, седзячых нібы санатары у старым Рымя.

„Наш журнал муся быць бяз жаднае палітыкі! Ні у права, ні у ліва—проста і толькі... Або вось шчэ... Другія кажуць, пускаць у ем стацьці на беларуску—і гэта ня вытрымоувая крытыкі: у беларусау німа свае мовы, а тоя, на чом яны брэшуць, то ім ня зразумела. Наш журнал павінян друкавацца парасейску... Усем цяперака столькі патрэбы! Беларусь-край ня спазнаны... яго трэ пазнаць добра, а тады ужо... пачууся вопляск слухачоу. Заляпау у далоні і Язэп „Прауду кажа ен! Галава! Усе-ткі прахвэсар, ня падшываняц які! Да дзіва, што яго гэта кніжка так усім падабаяцца! Кожная яго слова—адкрыцьця, сыстэма“.

Хутка прамоуца кончыу казаць і сталі галасаваць: на якой мовя выдаваць журнал. Усе і Язэп разам падынялі руку за расейскую. „Наш журнал будзя навуковы, а беларуская мова дзеля гэтаго ня гадна“, падмацавау ен свае галасаваньня.

— І прауда,—падхапіу другі.

— Выдумалі ліха ведая што: беларускую мову!—сказау стары паністы упраучы, у акулярах на ілбу.

— Забава людзям патрэбна! — дадау ня меннй заможны яго сусед.

— Вось я і камуніст, — выскачыу спераду некі даугэрны хлапчук,—а нізашта ня вазьму і у рукі журналу, калі ен будзя хоць с адным беларускім словам.

— Не, прозвішча трэба на беларуску. усе-ткі мы...

— Я прашу слова,— перабіу Язэп.

— Калі ласка,—пазволіу старшы.

— Памойму,—запрапанавау Язэп: трэба нам пісаць ні то па беларуску, ні то... не,—папрaвіуся ен:—я хацеу сказаць: нам трэба пісаць беларускаю моваю, добра схожаю з рускаю... з шчыра-расейскаю, бо мы... расейскай арыентацыі!

Апошняя слова ен прыцісну і ухмыльнууся ад здавольства.

— Беларуская мова—гэта са шляхоцкае кухні узята,—выгукнуу ізноу даугэрны хлопяц.

— Гэта мова Рады, незалежнікау, пацыяналістау-шавіністау,—задрабезіу яшчэ хтось з гуртка.

— Ну, дык на якой? запытау старшы.

— На расейскуй!!? — выкрычала з дзесяць галасоу.

— На расейскуй мовя, а прозвіска а беларуску!

— Наш край населян чатырмя народамі, дык і трэба на чатырох мовах: расейскуй, польскуй, украінскуй і... на беларускай.

— Я прапаную выдаваць журнал ля беларусау або на татарскуй, або на жыдоускуй мовах!—уткнуу хтосці.

